**Сцяпан Говін**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

# ПЕРШЫЯ ПЕРЫЯДЫЧНЫЯ ВЫДАННІ НА ТЭРЫТОРЫІ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСІ

Апошняя беларуская газета-аднадзёнка з цыкла друкаваных выданняў другой паловы XVI – пачатку XVII ст. «Новіны о шчаслівом поступанні на царство Московское Найяснейшаго Владыслава, Короля Польского. З дрэварытам, выабражаючага ў абозе паслоў масковскіх», была выдадзена ў 1617 г. У ёй распавядалася аб супрацьстаянні паміж Масковіяй і Рэччу Паспалітай на пачатку XVII ст. Пасля яе выхаду у свет выданне СМІ ў ВКЛ было прыпынена больш як на 60 гадоў і толькі ў 1678 г. непасрэдна на тэрыторыі сучаснай Беларусі стала выдавацца польскамоўная газета «Awizy Grodzieńskie» («Авізы Гродзеньске», «Гродзенскія весці»)[1].

Сама гісторыя арганізацыі гэтай газеты ўяўляе пэўную цікавасць. Справа ў тым, што па рашэнні Сойма Рэчы Паспалітай кожнае трэцяе яго звычайнае пасяджэнне вырашана было праводзіць у Гродна (як вядома, пасяджэнні Сойма праходзілі ў Кракаве, па тым часе сталіцы краіны – С.Г.). Тут для дэпутатаў Сойма ў некалькіх экзэмплярах рыхтаваўся рукапісны агляд важнейшых падзей у краіне і за яе межамі. Пэўна, аднастайная праца перапісчыкаў іх стамляла, таму і вырашана было рыхтаваць інфармацыйны бюлетэнь – газету, «пры дапамозе якой паслы Сойма знаёміліся б з больш шырокай інфармацыяй. Ідэя, відаць, спадабалася, і газета ў час правядзення звычайных соймавых сесій ў Гродна стала друкавацца пастаянна.

Першыя звесткі аб «Гродзенскіх весцях» з’явіліся толькі ў пачатку XXI ст., калі ў 18 томе «Беларускай энцыклапедыі» з’явіўся артыкул гродзенскага журналіста Я. Скрабоцкага [1].

Газета «Awizy Grodzieńskie», зразумела, была польскамоўнай. Яна выдавалася невялікім накладам на дзвюх паласах фарматам 13,5х20 см. Як сцвярджае Я. Скрабоцкі, у Ягелонскай бібліятэцы Кракаўскага ўніверсітэта захаваўся адзіны яе нумар, датаваны 13 снежня 1698 г. Змест выдання сведчыць, што ў ім пераважала палітычная інфармацыя. Здзіўляе як яе колькасць у газеце невялікага фармату, так і ў значнай ступені адносная аператыўнасць, а значыць, і дасведчанасць яе журналістаў. Вось

---

[1] Авіза – фінансавая лексема, якая абазначае: а) банкаўскае паведамленне; б) паведамленне аб зменах ва ўзаемных разліках, якія адзі контрагент дасылае іншаму.

толькі найбольш важныя паведамленні з гэтага адзінага нумара, што захаваўся: феадальная вайна ў ВКЛ (1697–1702 гг.), абмеркаванне скліканай 21 лістапада 1698 г. радай упаўнаважаных у Гродна з пасланнікам караля, які спецыяльна прыехаў сюды з Брэста з паведамленнем аб супрацьстаянні магнацкага роду Сапегаў шляхце ВКЛ – кароль якраз хацеў яго згладзіць, а таксама з паведамленнем аб паездцы дэлегацыі вайскоўцаў з ВКЛ да караля са сведчаннем іх вернападданіцтва, аб нямецкіх (саксонскіх) атрадах караля, якія засталіся на зімоўку ў Гродна, аб тым, што ў час паспалітага рушэння шляхты віцебскі кашталян М. Коцел стаў з войскам пад мястэчкам Жалудок, а харунжы ВКЛ Р. Агінскі – пад вёскай Стакліжкі і аб тым, што супраць іх былі гатовы выступіць харугвы з Троцкага ваяводства і інш. На старонках газеты друкавалася інфармацыя з Брэста, Львова, Кракава, іншых гарадоў і мястэчак краіны і замежжа. Між тым, тагачасныя ўмовы развіцця друкарскай тэхнікі не давалі магчымасці выдаваць газету ў большменш якасных тэхнічных умовах. Колькі нумароў газеты «Awizy Grodzieńskie» выйшла, калі яе выхад быў спынены – невядома.

Наступная газета ў Гродна выйшла толькі напрыканцы мая 1776 г. Поўная яе назва – «Газэта Гродзеньская партыкулярная (устарэлае – неафіцыйная, прыватная. – С.Г.) замест звычайнай пісанай». Нават у 90-я гг. мінулага стагоддзя многія даследчыкі лічылі, што яна сапраўды была першай друкаванай газетай на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Так, рэдакцыя «Звязды» ў інфармацыі без подпісу «Першая беларуская газета падабалася не ўсім…» [1] – у гэты час споўнілася 220 гадоў з часу яе выхаду – на просьбу чытача П. Каравайчыка со Слоніма расказаць аб «Газэце Гродзеньскай» больш падрабязна сцвярджала, што яна сапраўды з’яўляецца першай беларускай газетай. Цяпер мы дакладна ведаем, што гэта не так.

Ініцыятарам стварэння газеты стаў гродзенскі староста граф А. Тызенгаўз (1733–1785 гг.), вядомы палітычны і грамадскі дзеяч ВКЛ. Нездарма гродненцы і сёння шануюць гэтага чалавека: яго імем названа адна з плошчаў горада. А. Тызенгаўз – рэфарматар у многіх накірунках – ён быў ініцыятарам развіцця на Гродзеншчыне мануфактурнай вытворчасці, спрыяў рэарганізацыі сельскай гаспадаркі, стварэнню медыцынскай акадэміі, кадэцкага корпуса, школы будаўнікоў, бухгалтараў, мернікаў, арганізацыі тэатра, капэлы, сеткі парафіяльных школ, музычна-тэатральнай школы, гарадской друкарні і інш.

І вось газета… Праўда, арганізаваць яе А. Тызенгаўзу дапамог гродзенскі пашмайстар А. Сабалеўскі. Гэта менавіта ён дагэтуль ад

рукі перапісваў у некалькіх паасобніках для высокіх чыноўнікаў важнейшыя публікацыі з «Gazety Warszawskiej» («Газеты Варшаўскай»).

А. Тызенгаўз з просьбай аб адкрыцці выдання ў Гродна звярнуўся да караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага – па некаторых звестках яны былі знаёмыя – і атрымаў не толькі дазвол, але і пэўную фінансавую дапамогу. Друкарскае абсталяванне было закуплена ў Вільні, а ў Паставах наладжана вытворчасць паперы. Рэдактарам-выдаўцом газеты і быў прызначаны А. Сабалеўскі.

«Газэта Гродзеньска» выходзіла штотыднёва з мая 1776 г. да 1783 г. (?) невялікім фарматам, накладам да 300 асобнікаў [2]. Перш за ўсё ў ёй друкаваліся перадавыя артыкулы на эканамічныя і палітычныя тэмы, у якіх рэдакцыя дазваляла сабе пэўныя крытычныя закіды на работу Сойма, нават на некаторыя рашэнні самога караля, на працу двара, выбары паслоў, на ўлады Прусіі, якія жорстка абыходзіліся з жыхарамі на занятых польскіх землях. Такія дзеянні рэдакцыі былі занадта смелымі, бо дазволіць сабе друкаваць нават перадавыя артыкулы, не гаворачы ўжо пра іх крытычны змест, магла толькі занадта смелая газета [3]. У ёй друкавалася інфармацыя аб узаемаадносінах паміж сабою краін Еўропы – Прусіі, Расіі, Аўстрыі, Рэчы Паспалітай, аб барацьбе за незалежнасць у ЗША, хроніка з польскага каралеўскага двара. Газета распавядала і аб іншых фактах. Напрыклад, аб канцэрце 17 студзеня 1781 г. у Гродна, які закончыўся прыгожай ілюмінацыяй, ці аб выніках публічных экзаменаў у Гродзенскай ваяводскай школе і інш. Не адмаўлялася яна і ад публікацыі сенсацыйных заметак, якія, на думку рэдакцыі, павінны былі прыцягнуць увагу чытачоў. Так, у адной з іх газета паведамляла, што ў Версалі спяклі з бульбяной мукі (крухмалу. – С.Г.) хлеб, які елі ў палацы і вельмі нахвальвалі яго за смак. Ці інфармацыя (зноў з Францыі) пра чалавека без рук, які навучыўся усё рабіць нагамі – есці, піць, уцягваць нітку ў вушка іголкі, шыць, страляць з пісталета, апрацоўваць агарод і інш. У другім нумары за 1779 г. газета паведамляла аб нараджэнні ў каралевы Францыі дачкі Марыі-Тэрэзы-Караліны, у пятым – аб спрэчках за карону Іспаніі, а таксама аб канцэнтрацыі войскаў на Дунаі і інш. Але перш за ўсё, зразумела, газета пісала аб сур'ёзных палітычных навінах, як, напрыклад, прыездзе 30 мая 1780 г. Кацярыны II у Полацк. Калі асвятляліся важныя падзеі, аб'ём газеты рэдакцыя павялічвала ўдвая.

І ўсё ж змест «Газэты Гродзеньскай» выклікаў незадаволенасць караля, асабліва яе крытычныя закіды на адрас яго асобы. Ста-

ніслаў Аўгуст некалькі разоў пісаў А. Тызенгаўзу, што газета часта згадвае імя расійскага пасла ў Рэчы Паспалітай Штакельберга, не задаволены ён быў і публікацыямі аб езуітах. Гродзенскаму старосту было прапанавана з ліку блізкіх да яго чыноўнікаў вызначыць асобу, якая праглядала б матэрыялы газеты перад тым, як здаваць іх у друк. Роля цэнзара ўрэшце была даручана сакратару А. Тызенгаўза Ф. Сухадольцу. Пасля гэтага «Газэта Гродзеньска» згубіла пэўную самастойнасць. Калі раней рэдакцыя толькі зрэдку рабіла перадрукі з цэнтральных польскіх і нямецкіх выданняў, дык цяпер гэтыя перадрукі з варшаўскіх і кракаўскіх газет сталі асноўнымі. Цікавасць у чытача да газеты зменшылася, пэўны час яна нават не выходзіла наогул.

Друкарняй кіраваў ксёндз. Уладамі дазволена было ў ёй змяшчаць рэкламу і аб’явы. Сярод іншых рэкламаваліся календары і кнігі, надрукаваныя ў гродзенскай друкарні, якія можна было набыць на складзе друкаванай прадукцыі. Права на друк рэкламы і аб’яў таксама было прывілеяй толькі абраных выданняў.

У лістападзе-снежні 1792 г. у Гродна двойчы на тыдзень – па серадах і нядзелях – выдавалася яшчэ адна польскамоўная газета – «Wiadomosci Grodzieńskie» («Вядомосьці Гродзеньске», «Гродзенскія ведамасці»). Газета перш за ўсё друкавала ўніверсалы, распараджэнні, рэкамендацыі Генеральнай канфедэрацыі абодвух народаў (Польшчы і ВКЛ – С.Г.), звесткі, звязаныя з дзейнасцю канфедэрацыі, а таксама мясцовую хроніку [4]. «Вядомосьці Гродзеньске» 5 і 12 снежня 1792 г. пісалі аб святкаванні імянін Кацярыны II у Гродне, аб прыездзе ў горад генерала М. Галянішчава-Кутузава, аб стварэнні дэпутацкай камісіі па распрацоўцы новай Канстытуцыі Польшчы (Канстытуцыя 3 мая 1791 г. у 1792 г. была адменена), аб захаванні парадку і бяспекі ў Гродне, выступала з прапановамі аб унясенні змен і дапаўненняў у Статут ВКЛ 1588 г.

Некаторыя матэрыялы з газеты перадрукоўвалі цэнтральныя выданні.

«Wiadomosci Grodzieńskie» былі закрыты напярэдадні другога падзелу Рэчы Паспалітай.

Тры польскамоўныя перыядычныя выданні на тэрыторыі сучаснай Беларусі напрыканцы 70-х гг. XVII–XVIII стст… Перыяд адноснай самастойнасці ВКЛ у канфедэрацыі з Рэччу Паспалітай… Затым амаль 125-гадовая няволя, пакуты і здзекі з беларусаў з боку расійскіх імперскіх сіл… Тры газеты… Кожнай з іх было наканавана выконваць сваю ролю ў пазбаўленні беларусаў нацыянальнай самасвядомасці, нацыянальнага гуртавання. Але нават у такіх

надзвычайных варунках, бы тыя вясновыя парасткі, што першымі прабіваюцца да святла і цяпла, маладыя сілы беларусаў цягнуліся да гэтага святла.

Гэта быў канец XVIII ст., надыходзіў час XIX стагоддзя, стагоддзя новых пакаленняў змагароў.

*Літаратура*

1. Скрабоцкі, Я.В. «Авізы Гродзеньске» / Я.В. Скрабоцкі // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. Т. 18. Кніга 1. – Мн., 2004.
2. Говін, С.В. Гісторыя беларускай журналістыкі (1563–1917 гг.): вучэб.-метад. комплекс / С.В. Говін. – Мн.: БДУ, 2003. – 99 с.
3. Мальдзіс, А.І. На скрыжаваннях славянскіх традыцый / А.І. Мальдзіс. – Мн., 1980.
4. Саланевіч, І.У. «Вядомосьці Гродзеньске» // Беларуская Энцыклапедыя: у 18 т. Т.4. – Мн., 1997. – С. 338.

**Сергей Горевалов**
*Институт журналистики*
*Киевского национального университета*
*им. Т. Шевченко (Украина),*
**Наталия Зыкун**
*Киевский международный университет (Украина)*

## ВОЕННЫЕ СМК УКРАИНЫ НА РУБЕЖЕ ВЕКОВ: ПРОБЛЕМЫ И ЗАДАНИЯ (евроинтеграционный процесс)

Украинская журналистика, в том числе и военная, на рубеже веков сыграла важную роль в развитии независимой Украины, ее вооруженных сил. Ведь смена власти, образа жизни и как следствие – мышление народа – это достаточно весомый стресс для нации в целом и ее вооруженных защитников в частности. Весомую роль в возведении демократии в обществе сыграли средства массовой информации. Как мощное звено социума они участвуют в формировании мнения общества, как канал передачи и получения информации являются важным компонентом коммуникации. Бурное развитие системы военных массовых коммуникаций предопределено потребностью силовых структур Украины в получении политической и социально важной информации, усилением ее роли в процессе демократизации армии, милиции, спецслужб, пограничных войск. Информация в условиях военной деятельности приобретает особенный смысл. Она становится средством противоборства при достижении заданий информационной и военной безопасности государства [2].